УДК 283/289 (476.5-21)

# ДА ГІСТОРЫІ ЕВАНГЕЛІЧНА-ЛЮТЭРАНСКАЙ АБШЧЫНЫ Ў ПОЛАЦКУ (КАНЕЦ XVIII – ПАЧАТАК XX ст.)

**Трыгорлава Людміла Браніславаўна**
Нацыянальны Полацкі гісторыка-культурны музей-запаведнік
(г. Полацк, Беларусь)

*У артыкуле даецца кароткая характарыстыка лютэранскай абшчыны ў Полацку пасля далучэння горада да Расійскай імперыі і асвятляецца пытанне, звязанае з будаўніцтвам у канцы XIX ст. каменнай кірхі.*

Лютэранства з’яўляецца адным з напрамкаў пратэстантызму, які атрымаў распаўсюджванне ў Вялікім Княстве Літоўскім яшчэ ў другой палове XVI ст. Паколькі Полацк уваходзіў у склад гэтай дзяржавы, то ідэі пратэстантызму знайшлі сваіх прыхільнікаў сярод немцаў і латышоў, якія пражывалі ў горадзе. З цягам часу ў Полацку сфармавалася евангелічна-лютэранская абшчына. Аднак у XVII – першай палове XVIII ст. у сувязі са шматлікімі войнамі яна практычна спыніла сваё існаванне.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А. А. Кулешова

Пасля ўваходжання Полацка ў склад Расійскай імперыі пачынаецца адраджэнне евангелічна-лютэранскай абшчыны і ў 1775 г. яна была афіцыйна зацверджана. Аднак веруючыя не мелі свайго малітоўнага дома, таму набажэнствы з 1778 па 1783 г. праходзілі ў палацы полацкага губернатара І.М. Рэбіндэра. Пасля яго ад'езду ў Ніжні Ноўгарад, члены абшчыны спрабавалі знайсці сродкі на набыццё зямельнага надзелу і будаўніцтва сваёй царквы. Аднак ажыццявіць гэтыя планы ім ўдалося толькі ў 1797 г. Пабудаваны малітоўны дом быў драўляны. Даўжыня залы для богаслужэнняў складала 10,67 м, шырыня – 8,53 м, а вышыня памяшкання дасягала 3,20 м. Дом абшылі дошкамі, пакрылі гонтам. Унутры сцены зацягнулі выбеленым палатном [1, с. 51]. Набажэнства ў ім праводзіў віцебскі пастар, паколькі першапачаткова мясцовыя лютэране адносіліся да Віцебскага прыходу, створанага яшчэ ў 1796 г. Пры гэтым прэсвітэр на пастаяннай аснове пражываў ў Полацку, а яго памочнікі – ад'юнкты – у Віцебску. У 1832 г. імператар Мікалай І зацвердзіў Статут Евангелічна-лютэранскай царквы і стварэнне Генеральнай кансісторыі ў Санкт-Пецярбургу. Адпаведна Статуту ўсе дзеючыя пастары павінны былі мець расійскае падданства і валодаць рускай мовай. Яны прыраўноўваліся да дваран, а частку жалавання атрымлівалі з дзяржаўнай казны.

У Полацку на пачатку 1860-х гг. пражывалі 64 лютэраніны, але іх колькасць пастаянна расла за кошт перасяленчых працэсаў, якія адбываліся на тэрыторыі Расійскай імперыі [2, с. 141]. Таму ўжо ў 1865 г. лютэранская царква аб'ядноўвала 189 гараджан і 85 жыхароў Полацкага павета [3, с. 292–293]. У 1860-я гг. набажэнства ў Полацку праводзіў Фрыдрых фон Гейнлет, які аддаў пастарскай службе больш за 30 гадоў. У 1867 г. у малітоўным доме лютэран быў зроблены сур'ёзны рамонт. Але ўжо праз 10 гадоў будынак канчаткова прыйшоў у стан трухлявасці і ўзнікла неабходнасць у будаўніцтве больш трывалай і змястоўнай каменнай царквы. Грашовых сродкаў на гэта ў абшчыны не было. У другой палове 1880-х гг. у горадзе і Полацкім павеце пражываў 451 лютэранін [4, с. 168–169]. Вялікія па колькасці абшчыны існавалі ў вёсках Вацлавава, Янова, Белае, Лоўша і інш. Свой малітоўны дом мела толькі абшчына ў в. Вацлавава. Астатнія вернікі наведвалі найбольш значныя набажэнствы ў Полацку, дзе іх праводзіў Эрнэст Готфрыд Каролін. З 1880 г. пастар пражываў у Віцебску, але кантраляваў работы па будаўніцтву кірхі ў Полацку. Яны вяліся ў 1887–1888 гг. Царква ўзводзілася з чырвонай цэглы ў неагатычным стылі, характэрнымі асаблівасцямі якога былі шпіль, вежы-пінаклі і стральчатыя вокны. Даўжыня кірхі складала крыху больш за 14 м, шырыня – амаль 95 м, умяшчальнасць – 170 чалавек [1, с. 51]. Новы храм урачыста адкрылі 18 снежня 1888 г. Яго асвяцілі і далі найменне ў гонар Св. Марыі. Абрад пачаўся ў 10 гадзін раніцы. Першапачаткова прыхаджане сабраліся ў былым малітоўным доме, дзе Э. Каролін прачытаў развітальную пропаведзь. Пасля гэтага ў кірху перанеслі Святыя дары і Евангелле, правялі набажэнства на 2-х мовах, па заканчэнні якога адбыўся святочны абед. На ім прысутнічалі члены царкоўнай рады, пастары з Дынабурга, Арла і Смаленска, а таксама асобы, якія прымалі ўдзел у будаўніцтве царквы [5].

У 1898 г. у Полацку была зацверджана пастаянная евангелічна-лютэранская ад'юнктура, якую ўзначаліў Феліко Макс Берчы (1866–1919). Фелікс атрымаў добрую адукацыю. Ён скончыў Мікалаеўскую гімназію ў Лібаве, у перыяд з 1887 па 1893 г. вывучаў тэалогію ў Дэрпцкім універсітэце. У 1895 г. Ф. Берчы ардынавалі



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

на пасаду ад'юнкта ў прыход Марыенбург-Зэльтынгоф у Ліфляндыі, а праз 3 гады ён пераехаў у Полацк. Фелікс Берчы быў жанаты на Алене Вейдэман. У 1900 г. у іх нарадзіўся сын Курт, а ў 1903 г. – дачка Маргарыта [1, с. 134]. Па некаторых звестках, дзякуючы сям'і Берчы, у полацкай кірсе з'явіўся арган, паколькі ад'юнкт быў знаёмы з сям'ёй Шульцэ – нямецкіх майстроў-арганістаў [6, с. 264]. Аднак, хто з братоў, Эдмунд ці Эдуард, яго вырабіў – дакладна невядома.

У пачатку XX ст. колькасць лютэранаў у Полацку ўзрасла да 298, а ў павеце – да 1390. Узнікла неабходнасць у стварэнні самастойнага Полацкага евангелічна-лютэранскага прыходу [7, с. 92–93]. Але вырашэнне гэтага пытання расцягнулася на гады. У 1901 г. абшчына набыла каменны дом з зямельным надзелам, дзе ўладкавалі пастарат і кістэрат (месца для даглядчыкаў храма). У верасні 1910 г. Ф. Берчы прызначылі пастаянным пастарам у Полацку. Акрамя набажэнстваў, ён вёў метрычныя кнігі, дзе ўлічваў усіх народжаных ў прыходзе, хрышчоных, узяўшых шлюб і пахаваных лютэран. Копіі гэтых запісаў пастар штогод адпраўляў у Мітаву, дзе размяшчалася Курляндская кансісторыя. У абавязкі Ф. Берчы ўваходзіла таксама наведванне хворых, клопат аб бедных, назіранне за рэлігійнай адукацыяй моладзі, наведванне школ. Ён быў законанастаўнікам у Полацкай жаночай гімназіі, адкрытай яшчэ ў 1903 г.

У 1914 г. пачалася Першая сусветная вайна. Полацк стаў прыфрантавым горадам. Тут размясцілася вялікая колькасць лазарэтаў і шпіталяў, куды дастаўлялі як параненых салдат рускай арміі, так і параненых нямецкіх ваеннапалонных. Памерлых там вернікаў-лютэран хавалі на могілках у Полацку. У 1915–1916 гг. пахаванняў рускіх вайскоўцаў было зроблена больш за тры дзясяткі і амаль два дзясяткі – нямецкіх ваеннапалонных, што зафіксавана Ф. Берчы ў метрычных кнігах прыходу. Дастаўляць копіі гэтых дакументаў у Мітаву ў ваенны час аказалася немагчымым, таму пастар адпраўляў іх у Генеральную кансісторыю ў Петраградзе. Пайшоў з жыцця Ф. Берчы ў 1919 г.

У наступныя гады евангелічна-лютэранская абшчына ў Полацку працягвала існаваць, але ўжо ў адпаведнасці з патрабаваннямі Савецкай улады. Абшчына прайшла рэгістрацыю, быў распрацаваны статут, заключаны дагаворы на ўтрыманне і страхаванне кірхі, выплачваўся падатак і інш. Але восенню 1924 г. сітуацыя змянілася. Вырасла запазычанасць абшчыны перад дзяржавай па зямельнай рэнце, а вясной 1925 г. вернікі не змаглі ўнесці страхавую плату за свой храм і капліцу на лютэранскіх могілках [8, арк.83]. Для ўлады гэта стала падставай, каб адмовіць лютэранскай царкве ў рэгістрацыі, што і было зроблена летам 1925 г. Кірху стала звычайным гарадскім будынкам, а метрычныя кнігі 1898–1917 гг., канфіскаваныя ў Алены Берчы, перададзены мясцоваму аддзелу запісу актаў грамадзянскага стану [9, арк. 159].

Такім чынам, умовы існавання ў Полацку евангелічна-лютэранскай абшчыны шмат у чым залежалі ад палітычнай сітуацыі той дзяржавы, у склад якой уваходзілі полацкія землі. Павелічэнне колькасці лютэранаў у другой палове XIX ст. садзейнічала афармленню самастойнага евангелічна-лютэранскага прыходу ў Полацку, а таксама будаўніцтву тут каменнай кірхі. Сёння гэты помнік архітэктуры неагатычнага стылю знаходзіцца пад аховай дзяржавы. У ім размяшчаецца Краязнаўчы музей, філіял Нацыянальнага Полацкага гісторыкакультурнага музея-запаведніка.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

## Літаратура


1. Князева, Е. Е. Лютеранские церкви и приходы в Белоруссии, Молдавии, Закавказье и Средней Азии XVIII–XX вв.: Ч. III. – СПб. : Гуманитарное информационное издательское агентство «Литера», 2006. – С. 51, 134.

2. Памятная книжка Витебской губернии на 1862 год. – Витебск : Типография губернского правления. – 1862. – С. 140–141.

3. Памятная книжка Витебской губернии на 1867 год / под ред. А. М. Сементовского – Санкт-Петербург : Типография К. Вульфа. – 1867. – С. 292–293.

4. Памятная книжка Витебской губернии на 1888 год / под ред. А. М. Сементовского – Витебск : Типография губернского правления. – 1888. – С. 168–169.

5. Воднева, И. П. Сведения о лютеранской кирхе [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http: / local.polotsk.museum.by. – Дата доступа: 20.03.2024.

6. Седова, Г. В. Мастер Э. Шульц из Динабурга: в поисках источников / Г. В. Седова // Гісторыя і археалогія Полацка і Полацкай зямлі: матэрыялы VIII Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі (Полацк, 1–2 лістапада 2022 г.) / уклад. Т. У. Явіч. – Полацк : Полацкае кніжнае выдавецтва, 2022. – С. 264.

7. Памятная книжка Витебской губернии на 1904 год. – Витебск : Губернская Типо-Литография. – 1903. – С. 92–93.

8. Занальны дзяржаўны архіў г. Полацка (ЗДАП) – Ф. 51. Воп. 1. Спр. 115.

9. ЗДАП. – Ф. 220. Воп. 1. Спр. 23.


Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова